## Алесь Анціпенка

# Не народны пісьменьнік

Васіль Быкаў быў першым сучасным беларускім пісьменьнікам агульна-нацыянальнага маштабу. Яму зусім не пасавалі самыя розныя савецкія пісьменьніцкія атрыбуты, у тым ліку і званьне «народны пісьменьнік Беларусі». Выглядала б парадоксам, калі б хтосьці назваў Камю, Бёля ці Кундэру «народнымі пісьменьнікамі». «Народнасьць» — савецкі анахранізм і толькі адна з эстэтычна-ідэалягічных плыняў літаратуры XIX стагодзьдзя, якая так і ня сталася эўрапейскай.

Творчасьць Быкава разгортвалася ў агульнаэўрапейскім літаратурным кантэксьце, а яе грунтам быў экзыстэнцыйны досьвед аўтара. А таму творчасьць Быкава іншая ад той, якою яе традыцыйна вызначаюць. Ягоную прозу нельга назваць ні «лейтэнанцкай», ні «прозай пра вайну». І ўжо зусім ня ёсьць яна прозай «пра гераізм савецкага воіна-пераможцы».

Быкаў экзыстэнцыйны ад пачатку і да канца. Вайна, насамрэч, — гэта «памежная сытуацыя», у якой знаходзіць сябе аўтар і героі ягонай прозы. І ў сваім экзыстэнцыйным, быкаўскім вымярэньні яна — страшны выбар паміж прагным, амаль жывёльным жаданьнем «застацца ў жывых» (Рыбак) і «чалавекам унутры чалавека» (Сотнікаў). Гэта страшны выбар, кошт якому — сьмерць.

БОГ, абставіны (?), лёс (?) падаравалі Быкаву жыцьцё. Можа быць, і дзеля таго, каб ён, першым зь беларусаў, стаўся эўрапейскім беларуска-нацыянальным пісьменьнікам.